Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2014 г.

## Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага герба РБ і Дзяржаўнага сцяга РБ

*7 мая*

На абанеменце цэнтральнай раённай бібліятэкі пачала дзейнічаць выстава "У кніжнай памяці – імгненні вайны", прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Барыса Васільева і юбілейным датам кніг пісьменніка – франтавіка "А зори здесь тихие» (45 год, 1969г.) і "В списках не значился" (40 год, 1974г.). Выстава прымеркавана да Дня Перамогі.

*ЦБ*

*8 мая*

У чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі ў рамках Дня Перамогі, 70-годдзя вызвалення Беларусі, 70-годдзя з Дня вызвалення Кобрына (20 ліпеня) арганізавана выстава-памяць "Аб вайне ў імя жыцця: Вялікая Айчынная на Кобрыншчыне". Выстава змяшчае шэраг разнастайных краязнаўчых матэрыялаў, у якіх адлюстроў-ваюцца падзеі пачатку Вялікай Айчыннай вайны, перыяд акупацыі, падпольны антыфашысцкі і партызанскі рух, вызваленне Кобрыншчыны, подзвіг нашых землякоў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама прадстаўлены фотаздымкі герояў, удзельнікаў той вайны; памятных месцаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной: помнікаў, абеліскаў, брацкіх магіл на тэрыторыі Кобрынскага раёна.

*ЦБ*

*9 мая*

Гарадзецкая СБ і Гарадзецкая сярэдняя школа - сад сустрэлі ўдзельнікаў раённага аўтапрабегу ў азнаменаванне 69-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне "Там кожны быў героем" з праграмай "Вечным сынам Айчыны". У мерапрыемстве прынялі ўдзел ветэраны Кобрыншчыны, члены ваенна - патрыятычнага клуба ДСААФ, кіраўніцтва Кобрынскага райвыканкама, Гарадзецкага сельскага выканаўчага камітэта і ААТ "Гарадзец-агра".

*Гарадзецкая СБ, 100 чал.*

*9 мая*

Лукская сельская бібліятэка, супрацоўнікі Дома культуры і навучэнцы Лукской СШ правялі литаратурна-музычны вечар, прысвечаны Дню Перамогі.

У праграме:

1.Выступление ЛПГ «Няхай памятаюць жывыя , няхай ведаюць нашчадкі, як маладыя ішлі на вайну ... »

Да выступлення ЛПГ была афармлена фотавыстава "Яны змагаліся за Радзіму", на якой былі прадстаўлены фотаздымкі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны , ураджэнцаў вёсак Лука, Зосін і Темра Старая.

2 . Выступленне агітбрыгады ДК "Новае пакаленне". У тэатралізаванай форме маладыя людзі ўспаміналі ваенныя годы, аддалі даніну памяці загінуўшым землякам у гады вайны.

*Лукская СБ, 110 чал.*

*9 мая*

Залеская сельская бібліятэка прыняла ўдзел у раённым аўтапрабеге па месцах баявой славы. У брацкай магілы партызан атрада імя Суворава адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны 69-й гадавіне Вялікай Перамогі «Мы жывем, каб пакінуць след». Хвілінай

маўчання ўшанавалі прысутныя памяць загінуўшых, ўсклалі кветкі і вянкі на магілу партызан, выказалі словы падзякі ветэранам.

*Залесская СБ, 50 чал.*

*9 мая*

Лiтаратурна-музычная вечарына “Песням тех военных лет, поверьте”. Падрыхтавана выстава, на якой прадстаўлены аўдыёдыскі, пласцінкі з песнямі ваеннай тэматыкі, партрэты кампазітараў і паэтаў, паэтычныя зборнікі аб вайне.

*Арэхаўская СБ, 20 чал.*

## Мерапрыемствы да Дня сям’і,

*18 мая*

Свята да Дня сям’і “Когда все вместе – душа на месте”. На мерапрыемства запрасілі бацькоў, дзяцей і настаўнікаў. Дзеці ўдзельнічалі ў гульнях, адказвалі на пытанні віктарыны, спявалі. Пераможцы атрымалі прызы.

Аніскавіцкая СБ, 15 чал.

18 мая

Дзень сямейнага адпачынку “Бібліятэка збірае сяброў”. У праграме:
- інфармацыйны агляд “Представляем новинки литературы”;
- выстава народнай творчасці сям’і Барзун “Радуга хорошего настроения» (работы з бісеру, кардону);
- канцэрт фальклорных груп «Успомнім годы маладыя».

*Тэвельская СБ, 25 чал.*

*21 мая*

Пасяджэнне аматарскага клуба “Светоч”: гадзіна адкрытай размовы “Семью сплотить сумеет мудрость книги”. У праграме:
- разважанне дзяцей на тэму “Как строить себя и свою семью”;
- знаёмства з бібліятэкай і яе заламі;
- прагляд лялечнага спектакля “Слагаемые здоровья”.

*ДБ, 20 чал.*

*22 мая*

Музычна-забаўляльная праграма "Калі ўсе разам - душа на месцы!" . ЛПГ "Натхненне" парадавала прысутных літаратурнай кампазіцыяй "Што можа быць сям'і даражэй? ", а творчы калектыў Гарадзецкага СК падарыў мноства выдатных музычных нумароў на тэму "Сям'я , любоў і вернасць". Гледачы прынялі ўдзел у музычна - паэтычнай віктарыне "Пра каханне нямала песень складзена ... ", у конкурсе "Я ведаю 100 прыказак пра сям'ю!" і ў бяспройгрышнай латарэі "Для душы , для дома , для сям'і!". "Усё пачынаецца з сям'і" - так называлася выстава літаратуры і перыядычных выданняў, падрыхтаваная да святочнага мерапрыемства .

*Гарадзецкая СБ, 15 чал.*

*25 мая*

Урок здароў’я “Табачная зависимость. Не создавай себе проблем”. Прадстаўлена выстава кніг і артыкалаў па тэме. Вялася размова об шкодзе курэння, якую небяспеку яно ў сабе таіць і як можна пазбавіцца ад гэтай звычкі самастойна.

*Гайкоўская СБ, 10 чал.*

## Выдавецкая дзейнасць

*7 мая*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены метадычныя рэкамендацыі па працы з дзецьмі ў летні перыяд «Канікулы ў бібліятэцы». Зборнік змяшчае інфармацыю аб

формах масавай работы з дзецьмі, спецыфіцы правядзення розных мерапрыемстваў, а таксама пералік цікавых ідэй і падыходаў для прыцягнення дзяцей да чытання.

*ЦБ*

*16 мая*

У цэнтральнай бібліятэцы прайшоў практыкум для сельскіх бібліятэкараў «Развіццё інфармацыйных рэсурсаў сельскай бібліятэкі". Супрацоўнікі ЦБС вывучалі такія пытанні, як: магчымасці цэнтра прававой інфармацыі, стварэнне паўнатэкставых краязнаўчых баз дадзеных, удасканаленне электронных прэзентацый сельскіх бібліятэк, ідэі афармлення кніжных выставаў на ваенна-патрыятычную тэму.

*ЦБ, 50 чал.*

Выканаўца: Мілашук Т. І.
аддзел маркетынгу